3. Пушкарев, Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории. – М., 1975.
4. Румянцева, М. Ф. Исторические источники XVIII – начала XX века // Данилевский И. Н., Кабанов В. В., Медушевская О. М., Румянцева М. Ф. Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории. – М., 1998. С. 466.
5. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі ( гісторыка-генетычнае і кампаратыунае вывучэнне): Вучэб. дапам. – Мн. : БДУ. 1999. – 193 с.
6. Malinowska, G. Pamiętnik kresowej nauczycielki z lat 1833–1921 / G. Malinowska – Bydgoszcz : Towarzystwo Milośnikow Wilna i Ziemi Wileńskiej, 1995 – 107 s.
7. Zapisano przez St. Hrebnickiego ze słów Adama Hrabnickiego w Raju w sierpniu w 1936 roku ( osobiste archiwum A. Rejmana)

**Ермалёнак В.А.**

## НОВЫЯ КРЫНІЦЫ АБ МАЁМАСНЫМ СТАНОВІШЧЫ ЗАМОЖНЫХ СЯЛЯН ДЗІСЕНШЧЫНЫ ПАЧАТКУ XX СТ.

Шмат таямніц хаваюць яшчэ гарышчы старых хат. Аб гэтым перакануаўча сведчыць набытая намі апошняя знаходка. Аляксандр Алегавіч Даргель, рабочы Мёрскага дзіцячага садка № 3, разбіраў са сваімі сябрамі старую хату на хутары, ля вёскі Якубаўшчына, Міёрскага раёна. На гарышчы ён заўважыў бляшаны цыліндр, у якім знаходзіліся старыя карты і дакументы, і вырашыў, што лепш за ўсё перадаць іх ў гістарычны музей СШ №3. Кіраўнік музея Вітаўт Ермалёнак набыў гэтыя экспанаты і адразу было праведзена іх першапачатковае даследаванне. Так як самай вялікай каштоўнасцю для беларускага селяніна была зямля, таму ў жалезны цыліндр і былі схаваны чатыры планы зямельных надзелаў. Найстарэйшы з планаў адносіцца да 1884 года [1, арк. 1]. Яго памеры 44 см. у даўжыню і 27 см. у шырыню. Выкананы ён, як і ўсе планы ў тыя часы, на тонкай парафінаванай тканіне, тушшу, каб на выпадак дажджу дакумент не быў сапсаваны. З надпісаў на ім мы даведваемся, што гэты план зямлі належыў селяніну Адаму Пугаўку, які жыў у засценку Падрэчкі Дзісенскага павета (зараз знаходзіцца ў Шаркаўшчынскім раёне). Згодна плану Адам меў 80 дзесяцін зямлі, што сведчыла аб яго заможнасці. Звычайна сяляне мелі ад 8 да 15 дзесяцін. Сярэдні надзел зямлі па Віленскай губерніі складаў у тыя часы 12 дзесяцін [2, с. 171]. З гэтай зямлі 33,05 дзесяціны было лесу, 16,75 дзесяціны раллі, сенакосу 10,82 дзесяціны, высечанага лесу 15,04 дзесяцін. Акрамя таго на сядзібныя і гаспадарчыя пабудовы было адведзена 2 дзесяціны, хмызняк і балота складалі 1,25 дзесяціны, дарога і рэчка займалі плошчу 1,03 дзесяціны. Зямельныя ўгоддзі Адама Пугаўкі межавалі з сенакосам і лесам маёнтка Юндзілова, з урочышчам Барсучына, з землямі маёнтка Мікалаёва памешчыка Клётта, з землямі дзяржаўнай вёскі Рэчкі. На плане мы бачым на поўдні ўскраек возера Глухога, у якое ўпадае рэчка Маціца, адсюль і назва засценка-Падрэчкі. Дарога, якая пралягала па зямлі Пугаўкі, вяла ў Стары Пагост. Чарцёж плана выканаў землямер К.Марцінкевіч, а копію з яго дваранін В.Ф.Радкевіч. Сапраўднасці плана была заверына подпісам члена ацэначнай камісіі Віленскага пазмельнага банку. Гэтыя землі раней хутчэй за ўсё належалі Францішку Канаплянскаму, які за ўдзел у паўстанні 1863 года быў арыштаваны, прыгавораны да катаржных прац у Сібіры і памёр на шляху да катаргі. Яго ўладанні былі канфіскаваныя і прададзеныя на публічных таргах у Вільні ў 1876 годзе. Для павелічэння рускага ўплыву землі прадавалі ў першую чаргу расійскім ваенным. Таму і набыў амаль тысячу дзесяцін зямлі і лесу адстаўны штабс-капітан рускай арміі Пётр Маслаў. Высекшы і распрадаўшы рыжскім яўрэям лес, ён усю зямлю ў 1881 годзе кавалкамі пачаў распрадаваць сялянам. Па 55 дзесяцін купілі тры браты Шэўчыкі і Аляксандр Ляскоўскі, 65 дзесяцін купіў Франц Рынкевіч. Адам Пугаўка, якому належаў план, як мы бачым, набыў найвялікшую колькасць зямлі – 80 дзесяцін. Па тых часах кошт яе складаў каля 3000 рублёў срэбрам. Гэта буйная на той час сума, бо карова каштавала ўсяго 10 – 15 рублёў. Адкуль у селяніна ўсяго праз 20 год пасля адмены прыгоннага права з'явілася такая сума грошай, мы пакуль не ведаем. Напэўна, частка іх была пазычана ў банку. Бо наступны з набытых намі дакументаў адносіцца да 1909 года. Гэта квіток Віленскага пазямельнага банка, які сведчыць аб тым, што пазычальнік Пугаўка цалкам разлічыўся з пазыкай, заплаціўшы банку 298 рублёў 65 капеек [1, арк. 2]. Падчас Першай сусветнай вайны, калі руская армія ў 1915 годзе паспешліва адступала, складаліся спісы маёмасці патэнцыяльных уцекачоў, якія маглі страціць сваю маёмасць падчас ваенных дзеянняў і бежанства. Таму і нашчадкі Пугаўкі склалі такі спіс маёмасці і яе кошту. Для нас гэты дакумент цікавы тым, што мы можам даведацца, якой маёмасцю валодалі заможныя



Репозиторий ВГУ

беларускія сяляне ў пачатку XX стагоддзя на Дзісеншчыне. Вось змест дакумента пад назвай: “Спіс рухомай і нерухомай маёмасці ўладальнікаў фальварка Рэчкі Адольфа, Купрыяна і Усціна Пугаўкі”, які таксама быў схаваны ў бляшанцы [1, арк. 3]. Напісаны ён на рускай мове. У дакуменце пералічаны ўладальнікі – сыны Адама Пугаўкі. Прыкладзены і спіс маёмасці, першымі ў пераліку ідуць пабудовы: дзве жылыя хаты коштам 120 і 100 рублёў, 10 хлявоў – 400 руб., два свірны – 400 руб., адна асець і пяць хлявоў – 600 руб. Для захавання панарадаў і фурманак мелася вазоўня коштам 50 рублёў, лазня каштавала 40 руб. Далей ідзе пералік сельскагаспадарчых раслін: зжатага жыта 400 коп (капа – 60 снапоў), пасеянага жыта 180 пудоў (пуд – 16 кг) сена 100 беркаўцаў (беркавец – 200 кг), аўса 600 пудоў, гароху 4 пуды, ячменю 450 пудоў, бульбы 800 пудоў, лёну 600 пудоў, канопляў 50 пудоў, буракоў 90 пудоў. У пераліку мы знаходзім яшчэ капусту і канюшыну. Такім чынам, аналізуючы спіс вырашчанай сялянамі Пугаўкамі прадукцыі, мы можам зрабіць вывад аб тым, што, як і большасць сялянскіх гаспадарак у тыя часы, яны спецыялізаваліся перш за ўсё на вытворчасці і продажы лёну, а таксама бульбы Далей ідзе пералік “жывой” прадукцыі. Першымі ў спісе названы пчолы – 18 вулляў коштам 329 рублёў, сем коней коштам 980 руб, 36 кароў – 380 руб, 52 авечкі – 260 руб, 30 свіней – 100 руб., 51 гусь – 15 руб, курэй 13 – за ўсіх 13 руб. Такім чынам, другі напрамак спецыялізацыі гаспадаркі, як бачым з пералічанага, – мяса-малочны. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць кароў і свіней, што задужа для патрэбаў нават трох сем’яў. Параўноўваючы з сярэднестатыстычнымі дадзенымі па Віленскай губерніі, дзе колькасць жывёлы на адну гаспадарку была наступнай: коней -3-4, кароў 7, авечак 4, свіней 3-4,з нашага дакумента мы бачым наколькі больш заможнымі былі гаспадары засценка Падрэчкі ў пачатку дваццатага стагоддзя [2, с. 181]. Далей у спісе пералічваецца сельскагаспадарчы інвентар, якім валодалі гаспадары Пугаўкі. Першай у пераліку названа самая дарагая машына – малатарня коштам 420 рублёў і конны прывод для яе – 130 руб. Наступная названая рэч – сячкарня для рэзкі саломы коштам 30 рублёў. У пераліку інвентару названы дзве веялкі, або арфы, кошт іх за кожную 20 рублёў, пушарка за 20 руб, льняная машына (хутчэй за ўсё механічная мялка лёну) – 30 руб, пяць ручных ільномялак – за ўсе 5 руб. Згодна статыстычных дадзеных 1910 года па Віленскай губерніі адна малатарня з конным прыводам прыходзілася ў сярэднім на дваццаць сялянскіх гаспадарак, адна веялка на 40 гаспадарак [2, с. 175]. Гаспадары мелі шмат зямлі, таму трэба было ім шмат розных фурманак. Найбольш дарагімі былі фурманкі з жалезнай воссю, коштам па 40 рублёў, тры панарады з драўлянымі восямі, трое караў для перавозкі сена або саломы – ацэнены кожныя па 20 руб. Асобна ў спісе названы колы для фурманак – тры пад драўляную і адно пад жалезную вось. Для парадных выездаў у Пугавак была лінейка за 30 рублёў і брычка за 80 рублёў. У спісе названы лёгкія зімовыя санкі за 15 руб, трое саней для перавозкі грузаў за 9 рублёў. Знаходзілася ў гаспадароў і ўся неабходная вупраж: 12 хамутоў, каб запрагаць калёсы, – за ўсе 82 руб, сем аромых хамутоў коштам 80 руб, сем падсядзёлкаў за 16 руб., шэсць дугаў за 6 руб. У спіс уключаны і чатыры пары раменных гужоў для аромых хамутоў, дзве пары раменных лейцаў, чатыры аброці за 2 руб, адны цуглі для аброці коштам 1 руб. У пераліку названы і сем плугоў коштам за ўсе 60 руб., пяць баронаў за 10 руб. З нашага спісу мы даведваемся, што ў заможных сялян, якімі былі Пугаўкі, ужо не было сахі , як інвентара для апрацоўкі глебы і драўляных плугоў і баронаў.У гэты час згодна статыстыкі па Віленскай губерніі ў палове гаспадарак сялян наогул не было плугоў, яны апрацоўвалі глебу толькі драўлянымі сохамі [2, с. 174]. Упераліку вупражы было названа адно сядло і адна гунька, каб накрываць каня зімою падчас прыпынку. У спіс маёмасці уключаны і разнастайныя інструменты: пяць сякер па 1 руб., тры аднаручныя пілкі і адна двухручная піла кожная па 1 рублю, два свёрдлы па 1 руб., корба (тып бурава) за 120 руб., тры далаты па 1 руб., шэсць гэбляў па 1 руб., чатыры крывыя сякеры за тры руб. (хутчэй за ўсё шклюты-сякеры для абчэсвання бярвенняў), тры малаткі за два рублі. У гаспадарцы ўлічана адна матыка за 1 руб., адны вілы для гною, двое вілаў для сена за два рублі, пяць сярпоў коштам 3 руб., чатыры касы па 1 руб., адзін разак для ворыва пусташы, адзін вох за 1 руб., тры нажы для апрацоўкі лёну, адзін жалезны шуфаль. Пералік прыладаў працы сведчыць, што іх было мала, каб апрацаваць усю зямлю. Таму можна зрабіць вывад, што нашы гаспадары наймалі для працы парабкаў са сваімі прыладамі працы: косамі, віламі, граблямі. У гаспадарцы было шмат жывёлы, таму ў маёмасці пералічаны разнастайныя віды скуры: скура сырамятая за 10 руб., скура мяккая за 20 руб., скура ласіная за 20 руб., дзве сырых скуры па 10 руб., тры аўчыны па тры руб. У спіс маёмасці ўключана і мэбля: два сталы за тры руб., тры шафы па 10 руб., пяць куфраў па 20 руб., дзве канапы за 6 руб., пяць крэслаў за 10 руб., чатыры ложкі за 10 руб. У сям’і



Репозиторий ВГУ

знаходзілася нават “панская” рэч – грамафон коштам 80 руб. З хатніх рэчаў пералічаны 9 карабоў за 18 руб., сем дзежак з дошак за 21 руб., тры самавары за 27 руб., два гадзіннікі за 25 руб., чатыры абразы за 5 руб., дзве лямпы за 5 руб. Вельмі дарага ацэнены чамусьці хатні посуд: тры міскі за 80 руб., два чайнікі за 60 руб., сем катлоў па 1 руб., малочнік за 60 руб. Хутчэй за ўсё гэта былі фірмовыя вырабы з парцаляны. Бо пазней пералічаны іншыя рэчы для ежы без пазначэння іх кошту: 12 талерак, 8 відэльцаў, 8 сталовых нажоў, адна цукарніца. Запісаны таксама два вядры для вады і дзве даёнкі. Для ложкаў было 13 падушак па 10 руб. кожная, адна пярына і дзевяць коўдраў за 40 руб. У спісе мы знаходзім і пералік верхняга адзення: чатыры футры за 200 руб., чатыры паўшубкі за 40 руб., два асенніх паліто за два 45 руб., два армякі за 10 руб., адзін пінжак за 6 руб., тры касцюмы за 75 руб., два летніх паліто за 30 руб., адно футра жаночае за 36 руб.; столькі ж каштавалі два летнія жаночыя паліто, сакі жаночыя тры за 15 руб. У гардэробе знаходзім 12 жаночых сукенак за 106 руб. З абутку пералічаны трое жаночых ботаў за 15 руб., тры пары галёш за 12 руб., тры пары мужчынскіх ботаў за 20 руб. Ёсць у пераліку гіра і бязмен коштам за дзве рэчы тры рублі. Гаспадары з засценка Падрэчкі займаліся рыбалоўствам і паляваннем, аб гэтым сведчаць дзве стрэльбы (вось адкуль у іх і ласіныя скуры), два брэднікі для лоўлі рыбы. У пералік маёмасці ўключаны і 105 дошак, скрыня для мукі і жалезная штаба для закрывання дзвярэй. Як маёмасць упісаны і 25 дзесяцін лесу коштам 1000 руб., а таксама садовыя дрэвы: шэсць груш, 46 яблынь, 50 вішняў і сліў. З гэтага дакумента бачна, што за трыццаць год колькасць лесу скарацілася на 8 дзесяцін.

У бляшанцы-схованцы знайшліся і тры планы з міжваеннага часу.Яны таксама выкананы на парафініраванай тканіне рознакаляровай тушшу. Усе тры планы адносяцца да 1935 года, калі фальварак быў падзелены на парцэлы (асобныя ўчасткі), бо сям’я Пугавак павялічылася і трэба было надзяліць зямлёю нашчадкаў-унукаў Адама Пугаўкі. Начэрчаны план самай вялікай парцэлы складае памеры 39 на 38 см. [1, арк. 4]. Вялічыня змешчанага на ім самага вялікага надзела была 22, 6 гектары, з іх раллі 12,24 га, лесу 6,48 га, сенажацяў 2,348 га.,высечанага лесу 1 га.,пашы 0,09 га., дарогі 0,26 га.. Пад сядзібныя пабудовы адводзілася 0,18 га. Гэты надзел, напэўна, дастаўся старэйшаму сыну Адольфа – Ювеналю. Другі план памерамі 38 на 25 см. складзены на зямлю плошчай 5,7 га [1, арк. 5]. Не гледзячы на невялікія надзел, ён утрымлівае разнастайныя найменні зямлі. Так ў першай парцэле ворнай зямлі было 3,43 га, сенажацяў 0,52 га, лясоў 1,7, вады-рэчышча ракі Маціцы 0,0475 га. Трэці план найменьшага надзелу складаў памеры 38 на 29 см [1, арк. 6]. У самай меньшай парцеле пад сядзібныя пабудовы было адведзена 0,7 га, ворнай зямлі 1, 21 га, сенажацяў 1,61 га, дарогі, 0 187 га, вады 0, 04. га. Выканаў усе тры чарцяжы дыпламаваны інжынер-землямер Казімір Блажэвіч. На жаль, на планах няма імёнаў і прозвішча, каму былі выдзелены парцэлы.

Прайшло ўсяго 15 год – і пачалася калектывізацыя; лёс заможных гаспадарак быў вырашаны без удзелу саміх гаспадароў. У пастанове ваеннага трыбунала войскаў МУС па Полацкай вобласці мы знаходзім асуджаных уладальнікаў кулацкіх гаспадарак Шаркаўшчынскага раёна; паміж імі і прозвішча Пугаўкі Ювеналія Адольфавіча, гэта значыць сына Адольфа, імя якога мы знаходзім у нашых дакументах [3, с. 195]. Яшчэ адзін нашчадак з гэтай сям’і – Пугаўка Аркадзь Купрыянавіч – ваяваў супраць фашыстаў на фронце, стаў настаўнікам гісторыі, працаваў ў сярэдняй школе Новага Пагост на Мёршчыне. Але ў прыватных гутарках ніколі не ўзгадваў аб сваім сацыльным паходжанні. Лёс іншых нашчадкаў Адама Пугаўкі патрабуе далейшага даследавання.

1. Гістарычны музей СШ №3 г. Міёры. – Асноўны Фонд 15. Воп. 4. Арк. 1–6.
2. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.). – Т. 3. – Минск : Изд-во АН БССР, 1953. – 1020 с.
3. Памяць. Шаркаўшчынскі раён. – Мінск : Белта, 2004. – 512 с.

**Талерко В.А.**

## О ЧЁМ РАССКАЗЫВАЮТ ШУТКИ БАЛТИЙСКИХ НЕМЦЕВ

Культура балтийских немцев, проживающих на территории сегодняшней Балтии преимущественно до осени 1939 года, интересна для современного исследователя уже тем, что позволяет сравнить их культуру с культурами других народов. По определению Иоэла Вейнберга, профессора Даугавпилсского университета, «Культура есть исторически и социально обусловленное, объективированное в разнообразных продуктах человеческой деятельности отношение че-



Репозиторий ВГУ